основном в заграничные шапито, где лицезрел конную и разговорную клоунаду. И лишь с появлением первого стационарного цирка Никитина на белорусской арене стали появляться русские клоуны.

---

1. Бахтин, М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура Средневековья и Ренесанса / М.М. Бахтин. – М. : Художественная литература, 1990. – 44 с.

2. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII века: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – СПб. : Петербургское востоковедение, 2002. – 240с.

3. Куніцкая, Н. З гісторыі развцця цыркавога мастацтва на тэрыторыі Беларусі/ Н. Куніцкая // Беларускі унверстэт культуры. Беларуская спадчына і сучаснасць, 1996. – 18-19 красавіка.

4.Макаров, С.М. Клоунада мирового цирка. История и репертуар / С.М. Макаров. – М. 2001. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Балаш-Елейнікава Г.А.,** студэнт 214т гр.
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПЕРСАНАЖАЎ УСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ МІФАЛОГІІ

Традыцыя язычніцтва, якая існавала на ўсходнеславянскіх землях са старажытных часоў, была дастаткова моцнай, каб пад уплывам хрысціянства не знікнуць цалкам, а пачаць суіснаваць з новай рэлігіяй. Такім чынам узнік феномен дваяверства (ужываецца таксама тэрмін *народнае хрысціянства*): былыя прадстаўнікі політэізму прымалі

монатэістычную рэлігію хрысціянства, але пры гэтым працягвалі ўшаноўваць сваіх старых багоў і прытрымліваліся дахрысціянскага календара.

У навуцы даказана, што паступова, прыблізна да XII ст., хрысціянства ўсё ж усталявалася на тэрыторыях усходніх славян як адзіная рэлігія. У нашых суседзяў-літоўцаў хрысціянізацыя скончылася пазней за ўсе народы Еўропы – толькі к XIV ст. Вядома, што ў нас хрысціянства ў яго народнай версіі захавала элементы язычніцтва (царкоўныя святы дапасаваліся да язычніцкага календара, хрысціянскія святыя ўзялі на сябе функцыі асобных язычніцкіх багоў і персанажаў ніжэйшай міфалогіі і інш.).

Пытанне трансфармацыі ў народнай свядомасці персанажаў язычніцкай традыцыі ў хрысціянскіх святых разглядалася шматлікімі даследчыкамі, сярод якіх С. Талстая, Е. Леўкіеўская, М. Талстой, С. Санько, Э. Зайкоўскі, І. Крукі інш.У арыткуле разглядаецца гэта праблема на прыкладзе язычніцкай багіні *Мокашы* і хрысціянскай святой *Параскевы-Пятніцы*.

Уяўленне аб славянскіх язычніцкіх вераваннях дае ўнікальны летапіс «Аповесць мінулых часоў» (біблейскія часы – 1117 год), створаныў пачатку XIIст. у Кіева-Пячэрскай лаўры. Арыгінал летапісу страчаны, зараз мы маем толькі яго копіі. У «Аповесці мінулых часоў» апісаны пантэон кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча: «И нача къняжити Володимеръ въ Кыев единъ, и постави кумиры на хълм вън двора теремьнаго, Перуна древяна, а главу его сьребряну, а ўсъ златъ, и Хърса и Дажьбога и Стрибога и Смарьгла и *Мокошь*» [4, с. 207].

Імя *Мокашы* (альбо *Макошы*) стаіць апошнім у гэтым шэрагу. З аднаго боку, ёй не было месца сярод багоў-мужчын, якіх шанавалі князь і яго дружына, а з іншага боку, яна з‘яўляецца адзіным жаночым божышчам

у пантэоне, таму яе культ быў вельмі распаўсюджаны і шануемы жанчынамі.Узгадкі пра *Мокаш* сустракаюцца і ў іншых крыніцах («Слово некоего Христолюбца», рукапіс «О требокладении идольском»), дзе таксама пацвярджаецца існаванне адмысловых жрыцаў культу гэтай багіні [4, с. 209].

Пры рэканструкцыі асноўнага міфа ў Іванова і Тапарова *Мокаш* успрымаецца як жонка Грымотніка (Пяруна), але пры гэтым сустракаецца матыў здрады яе Пяруну з яго праціўнікам (Вялесам), за што багіня пазбаўляецца боскага і сямейнага статусу і ссылаецца з неба на зямлю, у хтанічныя воды [1, с. 311]. Тут прасочваецца сувязь *Мокашы* з Вялесам, што праяўляецца таксама ў некаторых супадзеннях іх семантыкі. Варта таксама адзначыць, што ў язычніцкім календары чацвер атаясамліваўся з Пяруном, а пятніца – з яго жонкай, *Макошшу* [1, с. 311].

Семантыку *Мокашы* можна акрэсліць так: ахова ўрадлівасці зямлі, шчаслівага шлюбу і дзявочага лёсу, плоднасць і дзетанараджэнне, сырасць (вада), прадзіва, цемра, сувязь з хтанічным светам, пятніца і звязаныя з гэтым днём забароны. В. Тапароў указвае на магчымую сувязь імені *Макошы* з індаеўрапейскімі каранямі *mok- – «вільгаць; мокры, вільготны» і *mokos-–»прадзенне» [1, с. 311].

Нашмат больш вядома пра *Параскеву-Пятніцу* – хрысціянскі аналаг *Макошы*. У хрысціянстве існуе некалькі святых з іменем *Параскева* (ад грэч. «Παρασκευή» – «пятніца, дзень прыгатавання»), першая з іх жыла ў III ст. і прыняла пакутніцкую смерць за сваю веру [3, с. 631].

Але культ *Пятніцы* на ўсходнеславянскіх землях мае больш глыбокія карані і існаваў яшчэ да з‘яўлення хрысціянства, таму з яго прыходам адбылося толькі спалучэнне традыцый. І хаця ў календары меўся пэўны дзень ушанавання *Святой Параскевы* (28.X/10.XI), кожная пятніца тыдня асацыявалася з гэтым персанажам. Шэрагам даследчыкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персанаж *Параскевы-Пятніцы* разглядаецца як не звязаны з пэўнай гістарычнай асобай, а як персаніфікаванае легендарна-міфалагічнае ўвасабленне выключнага ў гісторыі чалавецтва дня [2, с. 387]. У пятніцу жанчынам належыла трымаць строгі пост, прытым забароны тычыліся не толькі ежы, але і працы, якую нельга было выконваць у гэты дзень (прасці, мыць бялізну, купаць дзяцей і інш.), і нават посуду, адзення і палавых дачыненняў [1, с. 311].

Выявы*Пятніцы* часам размяшчалі на зрубе студні. У той жа час, іконы *Святой Параскевы* знаходзілі каля крыніц, вада з якіх пасля цудоўнага з'яўлення іконы набывала гаючыя якасці. *Пятніца* выяўлялася нярэдка з распушчанымі валасамі (г. зн. першародны, прыродны стан, персаніфікацыя дажджу, які абуджае зямлю), яна атаясамлівалася ў народнай традыцыі з вобразам павітухі, што ўказвае і на сувязь яе са хтанічным светам (бабка-павітуха сустракае «госця» з іншасвету і праводзіць шэраг рытуалаў па ўвядзеннінемаўля ў культурнае асяроддзе). Існуюць пэўныя засцерагальныя рытуалы, звязаныя з *Параскевай-Пятніцай*і хатняй жывёлай, пераважна буйной.

У пісьмовых дакументах XV-XVI стст. зафіксавана асаблівае шанаванне ў беларусаў Бога, Божай Маці, Святога Міколы і *Пятніцы* [1, с. 311]. Цікава, што Св. Мікалай, які часткова пераняў функцыі Вялеса, стаіць у гэтых вераваннях побач з *Пятніцай*, якая працягвала культ *Мокашы*.

Семантыка *Святой Параскевы-Пятніцы*: плоднасць, сувязь з іншасветам, урадлівасць, засцерагальная магія, адсочванне выканання этыкетных прадпісанняў звычаёвага права і пакаранне за невыкананне іх, прадзіва, вада (цудадзейныя крыніцы), ахова шчаслівага шлюбу (дзень ушанавання *Св. Параскевы* выпадае на час найбольш актыўнага правядзення восеньскіх вяселляў) [2, с. 388].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, перайманне *Святой Параскевай-Пятніцай* функцый *Макошы* відавочна, прытым падобная сувязь прасочваецца як з ёй, так і з бліжэйшымі персанажамі, якія маюць да яе дачыненне (Св. Мікалай – Вялес). Значыць, падобная трансфармацыя адбывалася на ўсходнеславянскіх землях досыць шырока, і на сёняшні дзень мы маем больш звестак аб хрысціянскай традыцыі, чым аб яе папярэдніках. Тым важней прасочваць такія сувязі і знаходзіць адпаведнікі хрысціянскім вераванням у язычніцтве, каб мець магчымасць прасачыць шляхі іх транфармацыі і адкрыць глыбінныя карані паходжання традыцыйных вераванняў.

---

1. Зайкоўскі, Э.Мокаш / Э. Зайкоўскі // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік / І. Клімковіч, В. Аўтушка – Мн. : Беларусь, 2011. – С. 311.

2. Крук, І.Пятніца / І. Крук // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік / І. Клімковіч, В. Аўтушка – Мн. : Беларусь, 2011. – С. 387–388.

3. Левкиевская, Е.Е. Параскева Пятница / Е.Е. Левкиевская, С.М. Толстая // Славянские древности / Н.И. Толстой – М. :Международные отношения, 2004. – Т. 3, С. 631–633.

4. Топоров, В.Н. Боги славянские/ В.Н. Топоров // Славянские древности / Н.И. Толстой – М. :Международные отношения, 1995. – Т. 1, С. 204–215.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ